Уладзімір СТАРЧАНКА

# МАДЭЛЬ НАЦЫЯНАЛЬНАЙ КУЛЬТУРЫ

Гомель 1994

vytoki.net

Modern History Archives
Archiŭ Najnoŭšaje Historyi
Fond 1/22 sprava C77

## УВОДЗІНЫ

Гістарычны працэс ажыццяўляецца непазбежна і незалежна ад волі асобных людзей, палітычных партый і нават народаў, таму галасаваць на ўсесаюзным рэферэндуме за захаванне СССР было гэтак жа бессэнсоўна, як і за тое, каб сонейка не ўзыходзіла. Але гэта зусім не азначае, што людзі не могуць уплываць на хуткасць і характар гістарычнага развіцця. Людзі могуць або спрыяць (свядома ці несвядома) развіццю гісторыі, або, ахвяруючы жыццём (звычайна чужым) яго тармазіць. Для прыкладу, Гісторыя яшчэ на пачатку 20-га стагоддзя вынесла свой прысуд Расійскай імперыі, але бальшавікі, ахвяраваўшы на алтар Сатаны жыццё каля 80 мільёнаў сваіх суайчыннікаў, здолелі адцягнуць выкананне прысуду на 74 гады. І ўсё ж тое, што павінна было здарыцца,—здарылася, і нават кансерватыўны Вярхоўны Савет Беларусі быў вымушаны пайсці на абвяшчэнне незалежнасці і суверэнітэту Бацькаўшчыны. Таму найлепшае, што могуць зрабіць людзі,—гэта паспрабаваць зразумець ход Гісторыі і не перашкаджаць яму (бо занадта ўжо дорага гэта каштуе), а спрыяць. Але рэваншысты як на Беларусі, так і ў Расіі не пакінулі планаў рэанімацыі расійскай імперыі хоць бы і ў выглядзе імперыі руска-фашыстоўскай. Беларусь, мяркуючы па стараннай падрыхтоўцы і зладжанаму ажыццяўленню крызісу нашай дзяржаўнасці, займае ў іх планах зусім не апошняе месца. Спрыяе гэтаму найперш адсутнасць нацыянальнай свядомасці ў значнай частцы беларусаў, што дазваляла раней і дае падставы цяпер выкарыстоўваць іх у антыбеларускіх мэтах. Калі для ажыццяўлення такіх планаў не хопіць, як у мінулыя разы, жыццяў кожнага чацвёртага, або трэцяга беларуса, то яны лёгка ахвяруюць і ўсіх астатніх. Як паказвае гістарычны досвед, з дапамогай мясцовых манкуртаў гэта ажыццявіць не вельмі складана. Галоўнае, толькі гаварыць, што беларусаў вынішчаюць дзеля іх жа карысці, і не забывацца кожную хвіліну ўзносіць да нябес самаахвярны подзвіг беларускага народу.

Што ж можна проціпаставіць сёння добра арганізаванаму і кіруемаму з-за мяжы антыбеларускаму руху? Як змяніць жудасны і звыклы лёс народа-ахвяры? Як зберагчы беларускі народ ад вынішчэння ў міжнацыянальных канфліктах, ці то пазбавіць удзе-



vytoki.net

лу ў расійскай грамадзянскай вайне, што ўсё больш набліжаецца? Як зберагчы і адстаяць незалежнасць Бацькаўшчыны, захаваць мір і дабрабыт у беларускіх хатах? Шлях тут ёсць толькі адзіны і добра вядомы—адраджэнне беларускай нацыянальнай культуры, як адзіна магчымага для нас спосаба існавання ў гэтым свеце. Іншага шляху ўратаваць жыццё народа няма, і ў гэтым мы ужо маглі пераканацца. Але адраджэнне нацыянальнай культуры—справа вельмі і вельмі складаная, і тут не абыдзешся без стварэння нейкай канцэпцыі або мадэлі нацыянальнай культуры.

Увогуле кажучы, канцэпцый-мадэляў адной і той жа з'явы можа быць створана вялікая колькасць. Яны могуць быць больш або менш складанымі і распрацаванымі, падкрэсліваць той ці іншы бок з'явы, або спрабаваць ажыццявіць інтэгральны падыход. Нарэшце мадэлі могуць быць слоўнымі.., механічнымі.., матэматычнымі, і гэта ўжо ў залежнасці ад ступені развіцця навукі, ў межах якой яны ствараюцца. Але ў любым выпадку мадэль павінна адпавядаць самае меншае двум асноўным патрабаванням: яна павінна быць простай і павінна працаваць (гэта значыцца дакладна апісваць стан з'явы ў мінулым і сучасным і тым даваць падставы для прагнозу). Правільна зробленая мадэль дае магчымасць свядома кіраваць станам з'явы або працэсу, бо дае магчымасць знайсці самі рычагі кіравання.

Мадэль нацыянальнай культуры, пра якую пойдзе гаворка далей, пакуль не можа быць ніякай іншай, як слоўнай, і ўжо з-за гэтага вельмі недасканалай. Больш таго, культура разглядаецца ў ёй у асноўным праз прызму свядомасці, што, на погляд аўтара, цалкам абгрунтавана, паколькі менавіта наяўнасць развітой свядомасці вылучае чалавека з жывёльнага свету і з'яўляецца генератарам вельмі спецыфічнай з'явы—чалавечай культуры. Культура тут разглядаецца як спосаб існавання чалавека, народа, цывілізацыі. Яшчэ хацеў бы заўважыць, а безумоўна чытач і сам бы заўважыў, што ў мадэлі не знайшлося месца такой надзвычай важнай з'яве культуры, як рэлігія, гэта зроблена не толькі дзеля прастаты, але і для таго, каб абудзіць думку чытача і «прымусіць» яго папрацаваць з мадэллю і самастойна вызначыць для рэлігіі пачэснае месца. Хай чытач даруе за такія прыёмы, бо я ў іх сам шчыра прызнаўся.

Прапануючы ўвазе чытачоў мадэль нацыянальнай культуры, хацеў бы спадзявацца на іх шчырасць і непрадузятасць, гатоўнасць зразумець і развіць, або прапанаваць сваё, а не толькі зруйнаваць і зганьбіць.



## МАДЭЛЬ НАЦЫЯНАЛЬНАЙ КУЛЬТУРЫ

### 1. Аб культуры.

Культура ў агульным сэнсе слова ёсць сукупнасць матэрыяльных і духоўных здабыткаў чалавецтва, што існуюць і праяўляюцца на бытавым, мастацкім, навуковым і духоўным узроўні. Пад культурай звычайна разумеюць і сам працэс стварэння пералічаных каштоўнасцяў. Да з'яваў культуры адносіцца ўсё, што чалавек робіць свядома, менавіта як чалавек. Адначасова да яе не адносіцца ўсё тое, што чалавек робіць несвядома, не ўсведамляючы сваю чалавечую сутнасць, усё тое, на чым не ляжыць пячатка свядомай чалавечай дзейнасці.

Агульначалавечая культура складаецца з нацыянальных культур ў выніку іх узаемадзеяння і ўзаемаабагачэння. Уціск, падаўленне або знішчэнне адной нацыянальнай культуры з боку іншай ёсць з'ява недапушчальная, што можа быць прыроўнена да злачынства супраць чалавечнасці. Страта любой нацыянальнай культуры збядняе культуру агульначалавечую, памяншае колькасць альтэрнатыўных варыянтаў развіцця чалавецтва, што вельмі небяспечна для ўсёй цывілізацыі.

### 2. Аб культуры нацыянальнай.

Нацыянальная культура ёсць сукупнасць матэрыяльных і духоўных каштоўнасцяў, што створаны нацыяй як супольнасцю людзей, што маюць агульную гісторыю, мову і рысы нацыянальнага характару, на падставе чаго ўсведамляюць сваю адметнасць і непадобнасць да іншых. Нацыянальная свядомасць—умова захавання і развіцця любой нацыянальнай культуры, бо без яе губляецца сам творца і носьбіт нацыянальнай культуры—народ. Народ, што пазбаўлены нацыянальнай свядомасці, не можа не толькі развіваць, але і наогул мець сваю адметную нацыянальную культуру, бо ён паступова страчвае ўласную гісторыю, мову, апошнія адметныя рысы нацыянальнага характару і памірае.

Нацыянальная культура ствараецца народам праз нацыянальную свядомасць, што ўсталёўваецца і мацуецца на глебе нацыянальнага характару, нацыянальнай мовы і нацыянальнай гісторыі, якія ў сваю чаргу вынікаюць (з рознай ступенню залежнасці) з нацыянальнага генатыпу і фенатыпу народа (мал. 1).



vytoki.net




Мал. 1.

Самое існаванне розных нацыяў і народаў на біялагічным узроўні забяспечваецца адметнасцю і ўстойлівасцю іх генатыпаў да знешніх (найперш палітычных) фактараў іх існавання. Менавіта таму, як у старажытны, так і ў наш час народы, што стваралі і ствараюць імперыі, калі не дае плёну культурная асіміляцыя (праз вынішчэнне нацыянальнай свядомасці) ўжывалі і ўжываюць апошні пачварны сродак—генацыд.

З трох каранёў нацыянальнай свядомасці найбольшую трываласць да знешніх фактараў і ўплываў мае, безумоўна, нацыянальны характар, бо ён у найбольшай ступені вызначаецца генетычным кодам народа. Меншую сувязь з генатыпам і фенатыпам народа мае нацыянальная мова, таму яна больш лёгка паддаецца ўплыву вонкавых фактараў і ва ўмовах мэтанакіраванай і дастаткова працяглай асіміляцыйнай моўнай палітыкі можа быць нават страчана. Але найменшую трываласць усё ж мае гістарычная памяць народа, бо яна ў найменшай ступені вызначаецца генетычнымі фактарамі і непасрэдна з іх не вынікае. Ва ўмовах акупацыі пазбавіць народ ведаў пра ўласную гісторыю найбольш проста, нацыянальнай мовы—значна больш складана, нацыянальнага характару—амаль немагчыма.

Уплыў, што аказвае на нацыянальную свядомасць народа кожны з пазначаных каранёў, таксама не раўнаважны. Але тут усё наадварот. Найбольшы ўплыў на ўзнікненне і захаванне нацыянальнай свядомасці мае праз гістарычную памяць нацыянальная гісторыя, меншы—нацыянальная мова і яшчэ меншы—нацыянальны характар.



vytoki.net

## 3. Аб стасунках і ўзаемадачыненнях культур.

Культуры розных народаў непазбежна ўступаюць у кантакт і ўплываюць адна на адну. У натуральных умовах гэтыя стасункі з'яўляюцца карыснымі, бо садзейнічаюць узаемаабагачэнню розных культур і больш гарманічнаму развіццю кожнай з іх. Але як толькі пачынаецца экспансія адной культуры супраць іншай, узаемаабагачэнне непазбежна змяняецца падменай і вынішчэннем. Гвалтоўная культурная экспансія ёсць злачынства, нават калі яна ажыццяўляецца выключна сродкамі масавай інфармацыі. І тым больш яна не мае апраўдання, калі яе ажыццяўленне забяспечваецца эканамічным закабаленнем або акупацыяй, штучным пазбаўленнем народа нацыянальнай свядомасці праз забарону мовы і скажэнне гісторыі.

Як сведчыць гістарычны досвед, натуральныя ўмовы для развіцця нацыянальнай культуры могуць быць створаны толькі ў незалежнай нацыянальнай дзяржаве, што клапаціцца пра адпаведныя ўмовы для падтрымання неабходнага ўзроўню нацыянальнай свядомасці, найперш праз надзейную абарону нацыянальнай мовы і гістарычнай памяці народа, захаванне традыцый.

Кожная культура мае права бесперашкодна панаваць у межах этнічнай тэрыторыі народа, што з'яўляецца яе творцам. Ніводная чужая культура ні з якой нагоды не мае права рабіць замах на гэтае натуральнае права.

Натуральным можна лічыць становішча, калі чалавек у межах этнічнай тэрыторыі свайго народа мае магчымасць свободна і бесперашкодна існаваць у сваёй нацыянальнай культуры і толькі пры ўласным жаданні далучацца да здабытку любой іншай. Цалкам ненатуральным з'яўляецца становішча, калі чалавек у межах этнічнай тэрыторыі свайго народа вымушаны існаваць у варунках панавання чужынскай культуры і не мець магчымасці бесперашкодна карыстацца сваёй.

## 4. Аб культуры беларускай.

Беларуская нацыянальная культура ёсць сукупнасць матэрыяльных і духоўных каштоўнасцяў, што створаны беларускім народам у мінулым і сучасным на бытавым, мастацкім, навуковым і духоўным узроўні. Да таго ж беларуская нацыянальная культура—гэта адзіна магчымы для беларусаў натуральны спосаб існавання, што забяспечвае яму ўмовы для рэалізацыі сваёй самасці і непаўторнасці ў акружэнні іншых народаў і ў адпаведнасці з аб'ектыўнымі законамі развіцця чалавечых супольнас-

цяў. Беларуская нацыянальная культура—спосаб самазахавання беларускага народа. Занепад нацыянальнай культуры непазбежна прыводзіць да фізічнага вынішчэння і нават самавынішчэння народа. Да з'яваў беларускай нацыянальнай культуры адносіцца ўсё тое, што беларусы робяць свядома, менавіта як беларусы. Таму ўмовай існавання і развіцця беларускай культуры ёсць наяўнасць нацыянальна свядомага беларускага насельніцтва. Кажучы інакш, умовай існавання і развіцця беларускай культуры ёсць наяўнасць у беларусаў нацыянальнай свядомасці.

Сучасны стан беларускай культуры не з'уляецца натуральным; што ёсць вынік двухсотгадовай акупацыі беларускіх земляў з боку расійскай імперыі (мал. 2.).




Мал. 2.

Палітыка, што праводзілася падчас акупацыі, мела мэтай поўную і канчатковую асіміляцыю беларусаў. Дзеля гэтага беларусам гвалтоўна укаранялася руская нацыянальная свядомасць праз укараненне рускай мовы і рускага погляду на гісторыю. Адначасова беларусы былі пазбаўлены права ведаць уласную гісторыю і карыстацца роднай беларускай мовай.

Нацыянальная самасвядомасць беларускага народа вымушана была сілкавацца амаль выключна з крыніцы адметнага нацыянальнага характару беларусаў, не маючы падтрымкі ад іншых, што фатальна стрымлівала развіццё беларускай культуры, вяло да фізічнага і духоўнага вынішчэння беларусаў. Але ў тыя непрацяглыя перыяды, калі беларуская мова і гісторыя атрымлівалі магчымасць далучыцца да свайго народа, можна назіраць магутныя ўсплескі нацыянальнай свядомасці, а ў выніку—і беларускай культуры на ўсіх яе ўзроўнях.

Сёння ўжо можна падвесці некаторыя вынікі двухсотгадовага жудаснага эксперымента. Можна канстатаваць, што ў выніку працяглай і мэтанакіраванай асіміляцыйнай палітыкі акупантаў пераважная колькасць беларусаў пазбавілася нацыянальнай свядомасці, пачала ўважаць сябе за рускіх. Больш таго, узнікла і праз рупліваe пеставанне распаўсюдзілася такая з'ява, як нацыянальны нігілізм—варожае і грэблівае стаўленне да беларускай культуры. Усё гэта паставіла пад пагрозу самое існаванне беларускага народа, бо страціўшы нацыянальную свядомасць, ён страціў і магчымасць бачыць і ўсведамляць свае ўласныя нацыянальныя інтарэсы і быў вымушаны коштам жыцця мільёнаў і мільёнаў беларусаў аплочваць чужынскія экспансіяністскія памкненні. Так было падчас вайны 1812 года, так было падчас першай сусветнай вайны, рэвалюцыі і грамадзянскай вайны ў Расіі, так было падчас другой сусветнай вайны і афганскай авантуры. Так можа быць і заўтра, калі незалежная беларуская дзяржава не здолее або не паспее стварыць спрыяльныя ўмовы для абуджэння нацыянальнай свядомасці беларускага народа і не зберажэ самога носьбіта і творцу беларускай культуры—беларускі народ.

Пры адсутнасці нацыянальнай свядомасці развіццё культуры немагчыма. Магчыма толькі імітацыя знешніх формаў рускай культуры, магчыма толькі правінцыйнае (у горшым сэнсе) кампіляванне, якое не мае ў культурна-гістарычным сэнсе ніякай самастойнай каштоўнасці, акрамя адмоўнага прыкладу для іншых. У гэтым можа пераканацца кожны, хто паглядзіць праграму «Крок» (сапсаваны «Погляд»), праграму «Навіны» (сапсаваная праграма «Час»), праграму «НІКА» (сапсаваныя «Весці»)... Прыклады можна доўжыць бясконца, але лепш зрабіць відавочны вывад, што толькі праз нацыянальную свядомасць можа ўзнікнуць той адметны погляд на свет, той адметны стыль, што будзе цікаўны не толькі для беларусаў, але і для рускіх, палякаў, французаў...

Аналізуючы сучасны стан беларускай культуры, нельга і перабольшваць дасягненні акупантаў. Па-першае, яны не паспелі кардынальна змяніць генафонд беларусаў, хоць у асобныя перыяды і ўжываўся як татальны, так і выбарачны генацыд. Па-другое, застаўся амаль нязменны нацыянальны характар беларусаў. Нават забыўшыся на беларускую мову, не ведаючы гісторыі свайго народа, беларус паводзіць сябе менавіта як беларус. Гэта малазаўважна ў зрусіфікаваным беларускім культурным асяроддзі, бо тут няма сапраўдных носьбітаў рускай культуры, але калі беларус трапляе ў сапраўды рускае культурнае асяроддзе за ме-



vytoki.net

жамі сваёй Бацькаўшчыны, то ён лёгка пераконваецца ў сваёй адметнасці, бо перастае разумець матывы дзейнасці людзей (магчыма гэтым тлумачыцца феномен М. Багдановіча?). Праўда, у выніку падвения самасвядомасці (мал. 2.) некаторую трансфармацыю рысы нацыянальнага характару ўсё ж пацярпелі. Часцяком можна сутыкнуцца з тым, што прастата ператвараецца ў хамства, талерантнасць—у бесхрыбетнасць, гасціннасць—у халуйства. Па-трэцяе, не дала патрэбнага плёну і моўная палітыка, бо беларусы хоць і забыліся ў большасці на родную мову, але і рускую не засвоілі. У выніку антыбеларускай моўнай палітыкі сёння беларускі народ не размаўляе па-беларуску, не можа размаўляць па-руску і вымушаны размаўляць на трасянцы—мове неадукаваных людзей. І гэта ёсць сапраўдны інтэлектуальны Чарнобыль, пра які не можна маўчаць, бо цэлы народ пазбаўлены магчымасці адэкватна ўспрымаць навакольны свет з-за штучнага разбурэння нацыянальнай логікі мыслення, што фіксуецца ў будове і логіцы роднай мовы.

Найбольшага поспеху акупанты дасягнулі ў справе пазбаўлення беларусаў гістарычнай памяці і замене яе на гістарычную памяць рускага народа. У гэтым накірунку як раней, так і цяпер працуюць сістэма адукацыі, сродкі масавай інфармацыі і навука гістарычнай фальсіфікацыі. Гэта становішча будзе захоўвацца да таго часу, пакуль у рэспубліцы будзе існаваць жорсткая цэнзура на беларускі погляд на гісторыю.

З усяго можна канстатаваць, што становішча беларускай культуры і самога беларускага народа на сваёй этнічнай зямлі з'яўляецца ненатуральным і небяспечным, але небезнадзейным. Галоўная падстава для аптымізму—гэта абвяшчэнне незалежнасці і паступовае напаўненне яе рэальным зместам, галоўная небяспека—ці то свядомы, ці то па інэрцыі, працяг старой антыбеларускай культурнай палітыкі.

## 5. Аб развіцці беларускай культуры.

Беларуская і іншыя нацыянальныя культуры павінны заняць належнае ім месца на беларускай зямлі. Беларуская нацыянальная культура, каб заняць сваё натуральнае месца, павінна запанаваць на этнічна беларускіх землях. Руская і іншыя нацыянальныя культуры павінны панаваць на этнічных землях сваіх народаў, на беларускай зямлі яны панаваць не могуць. У канкрэтных варунках, што склаліся на Беларусі, пашырэнне і развіццё беларускай культуры да некаторага моманту непазбежна будзе ажыццяўляцца за кошт згортвання ўплыву і нават выціскання рускай куль-



vytoki.net

туры. Ставіцца да гэтага трэба з паразуменнем, як да аднаўлення гістарычнай справядлівасці, як да простага ажыццяўлення беларускай культурай свайго натуральнага права.

З пункту гледжання развіцця беларускай культуры, галоўная задача сёння—стварэнне ўмоў для адраджэння нацыянальнай самасвядомасці беларусаў. Дзеля гэтага неабходна зрабіць захады для вяртання найперш гістарычнай памяці беларускага народа, беларускай мовы, традыцый і звычаяў, у якіх знайшлі адлюстраванне галоўныя рысы беларускага нацыянальнага характару. У гэтым сэнсе нельга недаацэньваць ролю сродкаў масавай інфармацыі, бо літаральна кажучы народ такі, у якім інфармацыйным асяродку ён жыве. Таму ніякім чынам нельга мірыцца з тым, што беларус дагэтуль вымушаны існаваць у варунках выключна расійскай інфармацыйна-культурнай прасторы, калі ні беларускі погляд, ні беларуская думка да яго фактычна не даходзяць.

З мэтай ўсталявання добрага супольнага жыцця на Беларусі для людзей рознай нацыянальнасці, пільна патрэбна іх дабразычлівае супрацоўніцтва ў справе беларускага нацыянальнага адраджэння, у справе стварэння ўмоў для натуральнага суіснавання розных культур. У гэтым сэнсе выключную ролю мае супрацоўніцтва на падставе ўзаемапавагі беларускай і рускай інтэлігенцыі, прыклады чаго сёння ўжо ёсць. А для гэтага ў нас ёсць усе падставы, бо ад таго, што мы ўсе разам не дазволім зацікаўленым імперскім колам разыграць на нашай зямлі рускую карту, выйграем ізноў мы ўсе—і беларусы, і рускія, і іншыя. Але якая б вялікая роля не належыла грамадскім арганізацыям, партыям і асобным грамадзянам, усё ж дзяржава не павінна забывацца на свае абавязкі.

Беларуская дзяржава (усе яе структуры), выконваючы сваё прамое прызначэнне і абавязак, павінна забяспечыць прыярытэтнае развіццё беларускай культуры. Палітыка адраджэння беларускай культуры павінна ажыццяўляцца дзяржаўнымі ўстановамі і за дзяржаўны кошт. Дзяржаўная нацыянальная палітыка павінна ажыццяўляцца праз:

— дзяржаўныя ўстановы ўлады і кіравання;
— сістэму народнай адукацыі;
— сродкі масавай інфармацыі;
— установы культуры.

Паколькі беларуская дзяржава сёння не можа і не хоча займацца адраджэннем нацыянальнай беларускай культуры і, больш таго, сёння менавіта ад Урада і Вярхоўнага Савета сыходзіць галоўная небяспека незалежнасці і фізічнаму існаванню нашага народа, то спадзявацца на выкананне ёй сваіх прамых функцыяў

у поўнай меры няма падстаў. Гэта накладае на ўсе палітычныя партыі, рухі, аб'яднанні, якія знаходзяцца ў межах палітычнага спектру рэспублікі (сюды не ўваходзяць тыя, што не прызнаюць права беларусаў на незалежнае існаванне, бо з'яўляюцца, па сутнасці, партыямі замежнымі), а таксама на ўсіх нацыянальна свядомых грамадзян абавязак узяць на сябе клопат культурнага адраджэння. Цяпер мы павінны ўсе разам парупіцца пра культурнае адраджэнне беларусаў, у тым ліку і праз прымус дзяржавы да выканання сваіх абавязкаў. Суверэнітэт, незалежнасць, без якіх не можа натуральна існаваць народ, усталёўваюцца найперш не праз межы і танкі, а праз свядомасць людзей. Такі суверэнітэт нікому не парушыць.

**У. СТАРЧАНКА.**

Здадзена ў набор і падпісана да друку 12.08.94.
Фармат 60×84¹/₁₆. Друк. арк. 0,75. Тыраж 1000 экз. Заказ 6832.
Ліцэнзія № 295.

Гомельская фабрыка „Паледрук" Міністэрства культуры і друку РБ.

vytoki.net